Алена КУПЧЫК:

«ПРА ТОЕ, ЯК Я ПАЧЫНАЛА ПРАЦАВАЦЬ У КАДРЫ, МОЖНА СКЛАДАЦЬ АНЕКДОТЫ»

Яна з тых жанчын, якія ўмеюць адстойваць сваю пазіцыю і ўласныя інтарэсы. Па яе версіі, усё атрымліваецца ў жыцці тады, калі не ісці супраць сябе і свайго сумлення. Схільная да самаіроніі, авантурызму і свабоды выражэння сябе ва ўсім. Аднойчы плануе напісаць кнігу для нашчадкаў і адкрыць сваю справу. А пакуль што выхоўвае дзіця, захапляецца аздабленнем мэблі і працуе на тэлебачанні. На тэлеканале «Мір» Алену Купчык можна ўбачыць у праграме «Агульны інтарэс» кожны панядзелак.

— Рыхтуючыся да інтэрв'ю, вельмі мала знайшла пра вас у сеціве. Гэта пазіцыя закрытасці ці асцярожнае стаўленне да публічнасці?

— Не, проста, калі я толькі пачынала працаваць, то была вельмі маладой. І ў нейкай ступені было рана знаходзіцца ў цэнтры ўвагі. А з прыходам на тэлеканал «Мір», дзе працую ўжо 12 гадоў, мабыць, таксама не было аб'ектыўных прычын «свяціцца», бо спачатку я вяла нейкія праекты, якія ствараліся толькі для расійскага вяшчання. Усё адбываецца вельмі правільна — кожнай падзеі свой час.

Наконт публічнасці, шчыра скажу, я не з тых, хто ставіцца да яе сур'ёзна. Мяне яна, хутчэй, забаўляе. У нас жа, хоць і з'явілася сфера тусовак і шоу-бізнесу, але ў ёй усе адзін аднаго ведаюць. Для мяне важна, каб была мяжа паміж асабістым жыццём і тым, чым я дзялюся са светам.

— Давайце аб прафесіі… Адкуль жаданне пайсці ў журналістыку?

— Смешная гісторыя была. Я вучылася ў спецыялізаванай школе і паглыблена вывучала іспанскую мову. Удзельнічала ў розных алімпіядах, але душа прасіла яшчэ нечага. І я разумела, што замежная мова без асноўнай прафесіі — не самы лепшы варыянт, бо добра мець нейкія веды як дадатак да асновы. І ў адзінаццатым класе, упэўненая, што паступаю на замежныя мовы, я пачала наведваць курсы падрыхтоўкі і пры гэтым паралельна пайшла на такія ж на журфаку. Нават бацькі не былі ў курсе маёй стратэгіі. У тым жа годзе я яшчэ ўдзельнічала ў рэспубліканскай алімпіядзе. А там была наступная сістэма: яе прызёры аўтаматычна маглі паступіць на адпаведны профіль ва ўніверсітэт. Выдзялялі адно месца на Мінск і пяць на рэгіёны. Я вырашыла: калі ўвайду ў шасцёрку, то паступаю на замежныя мовы. І, будзеце смяяцца, але я заняла сёмае месца. Бацькі тады вельмі перажывалі за мой выбар, але маўчалі. Так я трапіла на журфак. Цяпер такога авантурызму ўсё менш, а тады рызыкавала не раздумваючы.

Хочаш развіцця — прыдумвай сваё і новае.

— І якімі былі першыя крокі ў прафесіі?

— Я пачала працаваць у штаце на трэцім курсе. З'явілася разуменне таго, што шмат тэорыі і мала практыкі, таму, калі хачу займацца гэтай справай па жыцці, трэба здабываць практычны вопыт. А потым трапіла на тэлеканал «Мір», дзе былі маштабныя праекты, дакументальныя фільмы. Такую працу не параўнаць з навінамі і штодзённымі праектамі. Змагла навучыцца многім карысным рэчам. А веды, як вядома, за плячыма не насіць.

— «Проба сябе» ў кадры цяжка давалася?

— Пра тое, як я пачынала працаваць у кадры, можна складаць анекдоты. Я, можа, таму з пэўнай іроніяй стаўлюся сёння да «зорнасці» на экране. Падчас першых эфіраў у мяне на зубах стаялі брэкеты. Каб іх неяк замаскіраваць, я рабіла «вініры» з жавальнай гумкі. З-за гэтага ў пэўнай ступені змянялася манера гаварыць. Нават дзіўна, як пагаджалася на такія эксперыменты маё кіраўніцтва. А вось хваляванне заўсёды адсутнічала. Мне, праўда, не даводзілася працаваць у прамым эфіры. Там, кажуць, атрымліваеш ні з чым не параўнальны адрэналін. А праца ў запісе заўсёды дае магчымасць выправіць нейкія няўдачы, больш звяртаеш увагу на сваю дыкцыю, на тое, як трымаешся ў кадры, як падаеш матэрыял. Наогул, мне здаецца, усё гэта альбо ёсць у чалавеку, альбо няма...

— «Мір» з тых тэлеканалаў, куды не проста трапіць…

— Калі прыйшла сюды, то быццам нанова пачала вучыцца. Былі розныя праекты, назапашвала вопыт. Напрыклад, праграму «Мар! Дзейнічай! Будзь!» я прыдумала за вечар, таму што хацелася новых крокаў пасля праекта «Як жывяце-можаце» (гэта была серыя дакументальных праграм). А ў нас якая пазіцыя на канале: хочаш развіцця — прыдумвай сваё і новае. Тады якраз была замова з Масквы на маладзёжны праект. Я села і зрабіла. Працавала ў ім тры гады, потым сышла ў дэкрэт, вярнулася. На праграме змянілася каманда і фармат, але ён вось ужо восем гадоў жыве.

— Сёння вы ў праекце «Агульны інтарэс» разглядаеце актуальныя тэмы. Як удаецца знаходзіць герояў?

— У нас вельмі шчыльны графік падрыхтоўкі праграмы, і праца будуецца адпаведна. Мы з Андрэем (Андрэй Алексіенка — сувядучы.— **Аўт.**) па чарзе прыдумваем тэмы, распісваем, арыентуючыся на герояў. А вось шукае іх і дамаўляецца пра сустрэчу наш прадзюсар Таццяна Раманава. Класны герой забяспечвае поспех праграмы: здабыўшы добры матэрыял, потым і тэкст лёгка напісаць, і зманціраваць. Тады нават сама праграма глядзіцца на адным дыханні. Тэлебачанне — гэта вынік каманднай працы, дзе ад аднаго залежыць праца іншых. Я працую з цудоўнымі людзьмі. Вялікая ўдача, калі прысутнічае паразуменне з вядучым, рэжысёрам. Я, напрыклад, не магу дазволіць сабе не прачнуцца раніцай і не сесці за працу, бо ведаю, што іншыя калегі чакаюць.

— У вас праграма будуецца на супрацьлеглых пазіцыях. Калі здараецца, што герой выказвае сваё бачанне і яно адрозніваецца ад патрэбнага вам, то як «накіроўваеце» яго?

— Кіраваць любым чалавекам складана. Спачатку нават губляліся, сядзелі і думалі: на што мы страцілі час, як вывесці яго на патрэбныя думкі? Цяпер такіх момантаў ужо значна менш. Трэба рыхтавацца да любых паваротаў яшчэ на стадыі планавання, інакш такія недахопы спрацуюць нам у мінус. Стараемся больш дакладна акрэсліваць свае пазіцыі і размяжоўваць пункты гледжання герояў. У адной з нядаўніх праграм «пісалі» сямейную пару псіхолагаў і ўдалося падвесці іх да таго, што адзін спецыяліст быў на маім баку, а другі адстойваў пазіцыю майго сувядучага, хаця спачатку яны прытрымліваліся аднолькавых поглядаў.

— Ад чаго, на вашу думку, залежыць поспех таго ці іншага праекта сярод гледачоў?

— Па-першае, павінен быць фармат, якога няма на іншых каналах. Праект «Мар! Дзейнічай! Будзь!» не меў аналагаў ні ў нас, ні нават у Маскве. Яго глядзелі і глядзяць вось ужо восем гадоў — і добрыя рэйтынгі. Па-другое, трэба шукаць герояў. Калі чалавек ходзіць з канала на канал і расказвае пра адно і тое ж, то каму ён цікавы? Нарэшце, праца каманды — ад яе ж залежыць якасць здымкаў, мантаж і шмат іншых нюансаў.

Падчас першых эфіраў у мяне на зубах стаялі брэкеты. Каб іх неяк замаскіраваць, я рабіла «вініры» з жавальнай гумкі.

— Што для вас значыць быць журналістам?

— Я не стала б ідэалізаваць нашу прафесію. У нас такая спецыфіка працы... Зразумела, многае залежыць ад умення планаваць час. Але ў журналістыцы нельга пакінуць працу ў офісе і забыцца на яе да раніцы.

— У вас ёсць нейкая планка? Чаго хочацца дасягнуць у прафесіі?

— Я хацела паступіць у Маскву на рэжысёра. Але з часам зразумела: няма ў гэтым неабходнасці, бо, можа, трохі саманадзейна прагучыць, я шмат што ўжо ўмею рабіць. У мяне была магчымасць паспрабаваць сябе ў якасці і рэжысёра, і аўтара, і вядучай. Магу сама манціраваць, музыку падбіраць. Яшчэ прыйшла да высновы, што кар'ера, дасягненні — не самае галоўнае, і такая пазіцыя нармальная. Самае страшнае для мяне, калі людзі не развіваюцца.

Алена ДРАПКО.

■ Неасабісты суб'ектыў

ВЫКАРЫСТАНЫ ШАНЦ

Нітку жыцця можа перарэзаць толькі той, хто яе падвесіў. Але ёсць людзі, якія не даюць ёй абарвацца, калі яна становіцца тоненькай

Днямі прыйшла сумная вестка: памерла жанчына, якой першай у Беларусі перасадзілі сэрца. Ёй стала блага ноччу, і ўрачы не змаглі яе ўратаваць: новае сэрца не захацела больш біцца. Яна пражыла пасля аперацыі пяць з паловай гадоў. Паспела падгадаваць малодшага сына (яму цяпер шэсць) і паставіць на ногі старэйшага — хлопцу ўжо васямнаццаць…

Падобная інфармацыя ў наш час разносіцца імгненна, і тут жа знаходзіць сваіх каментатараў: чужое гора, па няпісаных законах нашай існасці,— найлепшая нагода пагаварыць. Ахвотнікаў выказацца ў гэтым выпадку знайшлося больш чым дастаткова. Толькі на адным папулярным інтэрнэт-партале за суткі сабралася больш за трыста каментарыяў. Сярод іх словы спачування сям'і памерлай і спробы сказаць аб тым, што менавіта дзякуючы ўрачам жанчына пражыла яшчэ пяць з паловай гадоў, проста патанулі і згубіліся ў суцэльным гуле незадаволеных: маўляў, што ў нас за медыцына, вось вам і «высокі ўзровень», а колькі было шуму пра поспех… І хоць псіхолагі сцвярджаюць, што большасць інтэрнэт-каментатараў людзі, як правіла, незадаволеныя ўсім і ўсімі і што ўступаць з імі ў палеміку бессэнсоўна, бо ўсё роўна нікога ні ў чым не пераканаеш, менавіта ў гэтым выпадку мне проста карціць паспрачацца. Магчыма, таму што ў свой час давялося да тэмы трансплантацыі як адзінага спосабу выратаваць чалавеку жыццё спрычыніцца самым непасрэдным чынам.

Уласна, з гэтай няпростай тэмы мая журналісцкая кар'ера і пачалася. Тады дзядзька Валодзя, мамін стрыечны брат, вельмі цяжка захварэў. Раптоўна 42-гадовы моцны мужчына, першакласны слесар на заводзе, весялун і жартаўнік ператварыўся ў інваліда, асуджанага на пакутніцкую смерць. У яго раптоўна і адначасова адмовіліся працаваць абедзве ныркі. Дыяліз — працэдура, якая выконвае іх функцыі (хворы вымушаны амаль штодня нерухома ляжаць некалькі гадзін, фактычна прыкаваны да адмысловага апарата) яго не ратаваў, з кожным разам станавілася толькі горш… Дзядзьку Валодзю пашчасціла: знайшлася донарская нырка, у 4-й клінічнай бальніцы Мінска яму зрабілі перасадку. Але звалілася новая бяда: скончыліся лекі, якія хворы павінен быў прымаць усё астатняе жыццё, каб новы орган арганізм успрымаў як свой. Дзяржава іх проста не закупіла: быў 1993 год, чыноўнікі ад медыцыны пакінулі ў спісе неабходнага нейкія найноўшыя акуляры, а гэты прэпарат проста выкраслілі.

Пра ўсё гэта з болем і прыкрасцю мне расказваў хірург Генадзь Казлоў, які рабіў дзядзьку аперацыю. Публікацыя ў «Звяздзе» мела тады шырокі рэзананс, грошы на лекі хутка знайшліся, некалькі дзясяткаў жыццяў (а лік людзей з перасаджанай ныркай ішоў у той час толькі на дзясяткі) былі выратаваны.

Праз пару гадоў, калі ўзнікла новая праблема, урачы 4-й клінічнай выйшлі на газету самі. У тагачасным парламенце на разглядзе знаходзіўся праект «гуманнага» закона, які мог не тое што абмежаваць — забараніць трансплантацыю ўвогуле: усё гэта было на хвалі крымінальных гісторый на постсацыялістычнай прасторы аб несумленных урачах, якія выразаюць у пацыентаў здаровыя органы і прадаюць іх на перасадку. Вось тады мне і давялося на свае вочы пабачыць, што такое дыяліз: прыкаванымі да яго на бальнічных ложках ляжалі і маладыя мужчыны, і маладзенькія дзяўчаты. І ў вачах, і ў словах кожнага з іх чыталася такая надзея, такое неўтаймаванае жаданне жыць! Кожны верыў, што пакуты скончацца, што знойдзецца донар, што перасаджаны орган падорыць яшчэ некалькі гадоў побач з роднымі людзьмі…

Мы тады агульнымі намаганнямі перамаглі. Закон не быў прыняты, людзі атрымалі шанц на выратаванне, урачы — магчымасць аперыраваць далей. Пасля з'явілася моцная дзяржаўная падтрымка, новыя цэнтры з сучасным абсталяваннем. Лекі, якія падтрымліваюць донарскі орган, для пацыентаў бясплатныя. Асвоены самыя складаныя трансплантацыі, якія ў свеце робяць лічаныя краіны. Прычым, у адрозненне ад большасці з іх, у Беларусі свае грамадзяне за такія аперацыі не плацяць.

За ўсёй гэтай адладжанай сістэмай стаяць жывыя людзі. Самаадданыя прафесіяналы, якія праводзяць над аперацыйным сталом нярэдка па пяць-шэсць гадзін, трацячы ўласнае здароўе дзеля іншых (думаю, нікому не трэба расказваць, якая ў іх падчас аперацый каласальная нагрузка). Іх пацыенты, якія, знаходзячыся на парозе вечнасці, раптам атрымліваюць шанц яшчэ пажыць, сказаць нявысказаныя словы блізкім людзям, аддаць ім усю нерастрачаную любоў і пяшчоту, скончыць справы, якія не паспелі дарабіць да хваробы. Іх сем'і, якім даецца магчымасць жыць побач з родным чалавекам. Як доўга? Мне чамусьці здаецца, што тут ужо вызначаем не мы. І справа не ў тым, праз колькі хвілін прыехала «хуткая» і што рабілі медыкі. Бо, згадваючы класіка, нітку нашага жыцця пераразае той, хто яе падвесіў. Нашы трансплантолагі робяць і так амаль немагчымае, не даючы ёй абарвацца ў той момант, калі аднойчы яна становіцца тоненькай-тоненькай…

Дзядзьку Валодзю пасля аперацыі ўрачы абяцалі пяць-сем гадоў жыцця. Ён радаваўся і гэтаму, а пражыў дваццаць адзін. Паспеў выгадаваць, вывучыць і аддаць замуж дачок, пацешыцца з унукаў.

Ён пражыў гэтыя дваццаць гадоў з пачуццём вялізнай удзячнасці да ўрачоў, якія яму гэтыя гады падарылі.

Наталля, тая, якой першай перасадзілі сэрца, таксама не стамлялася гаварыць словы ўдзячнасці ўрачам. Думаю, гэтыя самыя словы скажа і яе малодшы сын, калі вырасце. За тое, што ў яго была мама і ён запомніў яе рукі і вочы.

І гэта будзе ці не самы моцны аргумент, які наўрад ці аспрэчыць нават самы заўзяты незадаволены скептык.

Алена ЛЯЎКОВІЧ

■ Медыяпрастора

РАДЫЁ «МІР» АТРЫМАЛА ГРАН-ПРЫ КОНКУРСУ «ПРАДУКТ ГОДА»

Брэст	106.6 FM	Бабруйск	103.6 FM
Віцебск	101.8 FM	Баранавічы	98.4 FM
Мінск	107.1 FM	Салігорск	104.3 FM
Гродна	104.2 FM	Пінск	103.2 FM
Магілёў	107.8 FM		

Упершыню ў праграме конкурсу «Прадукт года», які заснаваны ў Беларусі ў 1998 годзе, з'явілася ўзнагарода для масмедыя. І яна — у радыё «Мір». Радыёстанцыі прысудзілі спецыяльную прэмію за аб'ектыўнае асвятленне падзей Беларусі і краін Садружнасці, актыўную працу па прасоўванні радыёстанцыі ў інтэрнэце і электронных СМІ, а таксама творчы падыход да падрыхтоўкі эфіру.

«Прыемна, што актыўная праца радыё «Мір» у інтэрнэце і друкаваных СМІ была заўважана,— адзначыў дырэктар Прадстаўніцтва МТРК «Мір» у Беларусі Уладзімір Пярцоў.— Сапраўды, мы нядрэнна папрацавалі. Але не варта спыняцца на дасягнутым. Ёсць яшчэ шмат непакораных вяршынь. Ёсць стымул імкнуцца і праяўляць актыўнасць».

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

ПАНЯДЗЕЛАК, 5 МАЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 19.40, 0.05 Зона Х.
9.10 Галоўны эфір.
10.05 Клуб рэдактараў.
10.50 «Зорнае жыццё». «Расплата за гордасць».
11.55, 15.25, 18.35 Eurovision. Без каментарыяў.
12.10, 0.50 Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
13.05 Серыял «Двайное жыццё». Заключныя серыі.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.30 Серыял «След».
16.30 «Сямейныя меладрамы».
17.30 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
19.55 Форум.
21.00 Панарама.
21.45 Меладрама «Каханне пад прыкрыццём».
23.50 Актуальнае інтэрв'ю.
0.40 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 10.15, 21.20 Тэлебарометр.
9.05, 17.55 Дэтэктыў «Прыгоды натарыуса Неглінцава». 1-я серыя.
10.50, 0.15 Серыял «Лялькі ведзьмака». 1-я серыя.
12.00, 19.00 Серыял «Бомба». 1-я і 2-я серыі.
13.50 «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
14.25 Серыял «Ластаўчына гняздо».
16.25 «Кіпень».
16.45, 23.35 «Перазагрузка». Маладзёжнае ток-шоу.
17.30 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
20.45 Дак. серыял «Азбука добрага самаадчування».
21.25 КЕНО.
21.30 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».
22.35 Серыял «Рэальныя хлопцы».
1.05 Музычны конкурс «GBOB» у Беларусі.

БЕЛАРУСЬ 3

7.20 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 13.30, 15.15, 17.00, 21.05, 0.35 «Калейдаскоп».
8.10, 13.40, 15.25, 17.10, 0.45 «Сімвалы эпохі». Хімічная завіўка.
8.20 Дзіцячы фільм. «Прыгоды Бураціна».
10.35, 22.00 «Дыя@блог». «Пра мову».
11.00, 21.15 Серыял «Мегрэ».
11.45, 0.10 «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Льва Абеліёвіча.
12.10, 16.35 «Размаўляем па-беларуску».
12.15 Шлягеры на ўсе часы. «Джаз і класіка».
13.55 «Дзядзечкаў сон». Маст. фільм.
15.35 «Янка Купала... Я адплаціў народу». Дак. фільм.
16.05 «Падарожжа са смакам». Турцыя.
16.40 М/ф.
17.25 «Настальжы». Жыццё і творчасць рэжысёра Барыса Уторава.
17.50 «Жывіце ў гармоніі». Дак. фільм.
18.20 «Беларусь на крыжы вякоў». Дак. фільм.
19.15 «Росчырк часу». Акварэлі Фелікса Гумена.
19.25 «Браты Карамазавы». Маст. фільм. 1-я серыя.
20.45 Калыханка.
21.15, 21.15 Серыял «Мегрэ».
22.25 «Маскарад». Маст. фільм.

БЕЛАРУСЬ 5

8.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Сандерленд».
10.05 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «БАТЭ» (Барысаў).
11.55 — 19.55 Тэніс. Турнір ВТА. Мадрыд.
19.55 Авертайм.
20.25 Час футбола.
21.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
21.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Крыстал Пэлас» — «Ліверпуль».
23.55 Тэніс. Турнір ВТА. Мадрыд.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00. 11.00. 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «У наш час».
12.05 «Яны і мы».
13.10 «Справа ваша...».
13.55 «Модны прыгавор».
15.00 «Сам-насам з усімі».
16.15 «Востраў Крым».
16.55 «Давай пажэнімся!».
18.20 Адваротны адлік. Рэклама па-савецку. Усё прадаць, акрамя Радзімы».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Пазіцыя».
22.05 «Вайна і міфы».
23.05 Вялікая вайна. «Ржэў».
0.05 Маст. фільм «Паляўнічыя на скарбы».
1.55 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.45 «Вялікае снеданне».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.40 «Такі лёс».
12.30 «Чатыры вяселлі».
13.50 «Вялікі горад».
14.30 «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». ВІА «Ё-ГУРТ» супраць групы «FORTISSIMO».
15.35 «Іншая краіна». «Казахстан. Дзе юрты суседнічаюць з хмарачосамі».
16.20 «Наша справа».
16.50 «Следакі».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Маст. фільм «Скразныя раненні».
22.10 «Глядзець усім!».
23.00 «Ваенная тайна».
0.00 «Белыя ваўкі». Серыял.

МІР

5.00 «180 хвілін».
7.15 Беларусь сёння.
8.15 Серыял «Сёстры».
10.00, 0.25 Маст. фільм «Мы смерці глядзелі ў твар».
11.30 «Наша марка».
12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
12.20 Серыял «Чужыя памылкі».
14.05, 4.10 Дак. фільм «Тайныя знакі».
15.20, 23.10 Ток-шоу «Слова за слова».
16.10 Серыял «Лепшы горад зямлі».
18.20, 1.50 Серыял «Дзеці Арбата».
21.20 Маст. фільм «Няўлоўныя мсціўцы».
22.45 «Беларусь сёння».
0.00 Агульны інтарэс.

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Карціна свету».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Прамы эфір».
12.55 «Асаблівы выпадак».
13.50, 16.50, 19.50, 0.15 Навіны — Беларусь.
14.30 «За перамогу — расстрэл? Праўда пра матч смерці».
15.35 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
17.40 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».
18.45 Серыял «Пакуль станіца спіць».
20.50 Маст. фільм «Пагавары са мною пра каханне».
0.25 «Дзяжурны па краіне». Міхаіл Жванецкі.

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.00 «Да суда».
11.55 «Суд прысяжных».
13.25 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.25 «Справа ўрачоў».
15.10 «Справа густу».
15.40, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 «Пракурорская праверка».
17.35 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.35 Серыял «Шэрыф-2».
23.05 Сёння. Вынікі.
23.30 Серыял «Інспектар Купер».

8 КАНАЛ

7.00, 13.30, 19.00, 20.55, 23.50 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30 Дак. фільм «Выратуй і захавай».
8.25 Серыял «Светлячок».
9.55, 17.55 Серыял «Смерць у раі».
11.00 Драма «Далорэс Клейбарн».
13.15 «Кінаблакнот».
13.35 Серыял «У чым віна Фатмагуль».
15.10 Дэтэктыў «Бацька Браўн».
16.30 «Мой любімы гадаванец».
17.00 Серыял «Свет без канца».
19.05 Серыял «Добрая жонка».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Драма «Піяніст».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00 «Кіно ў дэталях».
10.00 «Паспець за 24 гадзіны».
11.00, 19.00 Серыял «Маладзёжка».
13.00, 23.15 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
15.00 Серыял «Нанакаханне».
16.00 Прыгоды «Чорнае золата».
21.10 Камедыя «Нянькі».
0.00 «Лаві момант».

КУЛЬТУРА

6.00 «Еўраньюс».
9.00, 14.00, 18.00, 22.15 Навіны культуры.
9.15, 0.40 «Наглядальнік».
10.15 «Ганна Карэніна». Маст. фільм.
12.40 «Захавальнікі Меліхава». Дак. фільм.
13.05, 23.30 «Вялікія будынкі старажытнасці». Дак. серыял.
14.10 «Гісторыі ў фарфоры». Дак. серыял.
14.40 «Звычайны чалавек». Маст. фільм.
16.20 Юрый Цемірканаў і Акадэмічны сімфанічны аркестр Санкт-Пецярбургскай філармоніі ім. Д.Д. Шастаковіча.
18.15 «Саці. Нясумная класіка...».
18.55 «Правілы жыцця».
19.30 «Мая вялікая вайна. Галіна Караткевіч». Дак. фільм.
20.15 «Тым часам».
21.00 Зоркі рускага Авангарда. «Леў Куляшоў. Бачыць шчаслівых людзей».
21.25 Прыступкі цывілізацыі. «Ангкор — зямля багоў». Дак. фільм. 1-я серыя.
22.35 «Нямецкая крыжаванка. Цяжкасці перакладу». Дак. фільм.
0.20 К. Сен-Санс. Варыяцыі на тэму Бетховена.
1.40 «Сусветныя скарбы культуры».

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Аўтограф па суботах». Творчасць Васіля Ліванава. 1992 год.
5.30 «Вакол смеху» «Вясна». 1984 год.
6.15 «Нязнайка сустракаецца з сябрамі». М/ф.
6.40 «Пад знакам задыяка. Цялец». 1992 год.
8.10 «Брэйн-рынг». 1990 год.
9.00 «Дзякуй — усім!». Маст. фільм.
10.35 Канцэрт замежнай эстрады.
11.00 «Гэты фантастычны свет». «Бездань». 1987 год.
12.00, 3.00 «Колба часу».
13.00 Па старонках першамайскіх «Блакітных агеньчыкаў».
15.00 «Тэатральныя сустрэчы».
16.10 Тэлешоу «50/50». 1994 год.
17.00 «Зорная гадзіна». Сямейная тэлевіктарына. 1993 год.
17.45 «Відавочнае—неверагоднае». 1977 год.
18.30 «Карчмарка». Тэлеспектакль. 1975 год.
20.00, 2.00 «Мінулы час».
21.00 «Народжаныя ў СССР».
22.00 «Да і пасля паўночы». 1987 год. 1-я частка.
23.00 «У свеце жывёл». 1984 год.
0.05 «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
0.40 «Лепшая дарога нашага жыцця». Маст. фільм.
4.00 «Кінапанарама». 1979 год. 1-я частка.

EUROSPORT

9.30 Аўта- і мотаспорт.
9.45 Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
10.30 Настольны тэніс. Камандны чэмпіянат свету. Фінал. Мужчыны.
12.00 Тэніс. Турнір АТР. Адкрыты чэмпіянат Партугаліі. Фінал.
13.30 Тэніс. «Матс пойнт».
14.00, 20.00 Снукер. Чэмпіянат свету. Фінал.
19.00, 0.15 Футбол. Еўрагалы.
19.45, 1.00 Футбол. Бразілеманія.
0.00 Тэлечасопіс WATTS.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 2.20 Серыял «Як не варта жыць».
5.45, 2.50 Камедыя «Граф».
6.15 Камедыя «Беласнежка: помста гномаў».
8.00, 12.55, 16.10, 21.00 Серыял «Гэта ўсё пра Джоан». 1-я серыя.
8.45, 10.35, 13.45, 20.45, 21.50, 23.45, 1.50 «Камедыянты. Лепшае».
9.00 Камедыя «Мы — легенды».
11.15 Камедыя «Гаспадар у доме».
14.10 Камедыя «У джазе толькі дзяўчаты».
17.20 Камедыя «Законы прывабнасці».
19.20 Камедыя «Два ў адным».
22.10 Камедыя «Утаймаванне свавольных».
0.10 Меладрама «Удачы, Чак».
3.25 Камедыя «Парода бульдог».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.45, 18.30, 3.15 Серыял «Забароненае каханне».
10.15 «Паненка і кулінар».
10.45, 17.00 Дак. серыял «Паралельны свет».
11.45, 16.00 Дак. серыял «Варажбітка».
12.45, 18.00 Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
13.15 «Жонка. Гісторыя кахання». Наталля Белахвосцікава.
14.30 «Сто пытанняў даросламу».
15.15 Серыял «Звышнатуральнае».
20.15 «Шапавалаў». Серыял.
21.15, 4.40 Серыял «Жыццё і лёс».
22.00 «Скура, у якой я жыву». Маст. фільм.
00.10, 5.20 Серыял «Звышнатуральнае».
00.55 Серыял «Хадзячыя мерцвякі».
1.40 «Часова даступны». Раман Вікцюк.
2.35 «Без падману».

ТБ1000

5.00 Баявік «Чорнае золата».
7.30 Фантастыка «Паралельныя светы».
9.40 Камедыя «Браты Грым».
12.00 Драма «Чарадзейная краіна».
14.00 Камедыя «Я нармальна супер гуд».
15.50 Камедыя «Удар маланкі».
17.20 Меладрама «Міс Пецігру».
19.00 Трылер «Экстрасэнс».
21.00 Фільм жахаў «Ідэнтыфікацыя».
23.00 Камедыя «Пастка для нявесты».
1.00 Фільм жахаў «Страшыдлы».
3.00 Камедыя «Піпец».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Драма «Грэчаскія канікулы».
8.00 Фільм-казка «Чароўны партрэт».
10.00 Камедыя «Той яшчэ Карлсан!».
11.50 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Знаёмства».
13.10 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Крывавы надпіс».
14.30 Драма «Абраз сезона.»
16.00 Драма «Рабінавы вальс».
17.50 Драма «Збавенне».
20.00 Драма «Дом з вежай».
21.30 Камедыя «Зайцаў, палі! Гісторыя шоумена».
23.10 Драма «Мора».
0.40 Драма «Юнкеры».
3.30 Камедыя «Заза».
5.10 М/ф «Пра Фядота-стральца, удалага малайца».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
6.00 Дзікая прырода Амерыкі.
7.00 Рыбы-пачвары.
8.00, 13.00, 18.00, 21.00, 0.00, 3.00 Космас: Прастора і час.
10.00 Прыроджаны байкер.
11.00 Скарбашукальнікі.
12.00 Гульні розуму.
12.30 Займальная навука.
15.00 Палярны мядзведзь.
16.00 Паляванне на паляўнічага.
17.00, 2.00 Браты па зброі.
20.00, 1.00, 4.00 Навука будучыні Стывена Хокінга.
23.00 Турэмныя цяжкасці.

DISCOVERY

7.00 Амерыканскі чопер.
7.50 Выжыванне без купюр.
8.40, 20.35 Як гэта ўстроена?
9.10, 20.05, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35 Што ў вас у гаражы?
10.30 Top Gear.
11.25 Не спрабуйце паўтарыць.
12.20, 0.55 Эверэст: за мяжой магчымага.
13.15, 16.25, 6.05 Махінатары.
14.10, 3.55 Хуткія і гучныя.
15.05 Беар Грылс: кадры выратавання.
16.00 Пятая перадача.
17.20, 3.05 Паляўнічыя на рэлікві.
18.15 Неверагодны хмарачос.
19.10 Круцей не прыдумаеш.
21.00 Рэальныя дальнабойшчыкі.
22.00 Эд Стафард: як выжыць на незаселеным востраве.
23.00 Голыя і напалоханыя.
0.00, 5.10 Будучыня.
1.50 Сапраўдныя аферысты.
2.40 Маланкавыя катастрофы.